**Памяць.** Выстаўка «Зямны вандроўнік» да 90-годдзя з дня нараджэння беларускага празаіка, паэта, драматурга, публіцыста, перакладчыка Паўла Місько адкрылася ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Творчасць Паўла Місько прадстаўлена рознымі літаратурнымі жанрамі: казкамі, апавяданнямі, аповесцямі, нарысамі, вершамі, дзе гучыць заклік да справядлівасці, чалавечнасці, узаемадапамогі. Казкі, прыгодніцкія і фантастычныя творы пісьменніка сталі сапраўднай класікай, адзначылі ў НББ. Асобна прадстаўлена перакладчыцкая дзейнасць пісьменніка. Дапаўняе экспазіцыю літаратура пра жыццёвы і творчы шлях Паўла Місько.